Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»

РАБОЧИЙ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДАТУ
________________ І. М. Шыла
«28» ліпеня 2019 г.

Рэгістрацыйны № УД 967 /вуч.

# Гісторыя

вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па абавязковаму модулю для ўсіх спецыяльнасцяў

2019 г.

Праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы па абавязковым модулі "Гісторыя" для ўстаноў вышэйшай адукацыі, 30.06.2014 г., рэгістрацыйны № ТД-СГ.023/тып.

СКЛАДАЛЬНІК:

Грэбень Я. А., загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук і ўстойлівага развіцця Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;

Шымуковіч С. Ф., прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі РІВШ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»
(пратакол № 11 ад 19.04.2019 г.) Загадчык кафедры ________ Я. А. Грэбень

Навукова-метадычным саветам аграмеханічнага факультэта установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»
(пратакол № 10 ад 26.06.19) Старшыня НМС ________ Т. А. Непарко

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»
(пратакол № 12 ад 28.06.19) Старшыня НМС ________ М. М. Раманюк

Нормакантроль:

Начальнік ЦНМ і ВР ________ Л. К. Лоўкіс

Дырэктар бібліятэкі ________ С. П. Драпіцына

Адказны за навуковае рэдагаванне і выпуск: Я. А. Грэбень

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Месца вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі” у сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца тым, што прадметам яе вывучэння з’яўляюцца найбольш важныя пытанні дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў кантэксце ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай гісторыі з улікам цывілізацыйных характарыстык.

Актуальнасць вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі абумоўлена неабходнасцю выпрацоўкі аб’ектыўнага навуковага погляду на гісторыю беларускага народа, які сфарміраваўся ў працэсе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў. Гэта з’яўляецца абавязковай умовай, якая забяспечвае падрыхтоўку не толькі спецыяліста-прафесіянала, але і фарміраванне ў асобы якасцей грамадзяніна і патрыёта.

Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі» ва ўстановах вышэйшай адукацыі заключаецца ў набыцці студэнтамі практычных навыкаў аналізу гістарычных фактаў і падзей, што забяспечвае фарміраванне сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнта, заснаваных на сістэме каштоўнасцяў, якая сфарміравалася ў працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа і эвалюцыі яго дзяржаўнасці, што з’яўляецца тэарэтыка-метадалагічнай асновай, неабходнай для якаснай сацыяльна-прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

Для рэалізацыі вышэй азначанай мэты неабходна вырашэнне наступных задач:

- фарміраванне ў студэнтаў ведаў, уменняў, вопыту аналізу заканамернасцяў і асаблівасцяў дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага, духоўнага развіцця беларускага народа, якія ўвасоблены ў калектыўнай гістарычнай памяці і служаць асновай для нацыянальнай самасвядомасці пры ўспрыманні гісторыі як свайго мінулага;
- засваенне студэнтамі сістэмы духоўных, культурных, матэрыяльных каштоўнасцяў беларускага народа, і развіццё на гэтай аснове здольнасці да самарэалізацыі ва ўмовах сучаснай сацыякультурнай сітуацыі з асэнсаваннем сваёй ідэнтычнасці і перспектыў будучага развіцця;
- гатоўнасць выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у аб’ёме сваіх кампетэнцый, сфарміраваных у выніку ўсвядомленага засваення і выкарыстання вучэбнай гістарычнай інфармацыі, садзейнічаць дальнейшаму развіццю сваёй краіны.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта студэнт павінен ***ведаць:***

• асаблівасці фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да вывучэння і разумення гісторыі Беларусі ў кантэксце ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай цывілізацый;

• змястоўныя характарыстыкі працэсу этнічнага і нацыянальнага фарміравання беларускага народа на розных гістарычных этапах;

• сутнасныя характарыстыкі гістарычных форм дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі і станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў ХХ-пачатку ХХІ ст.;

• характэрныя рысы і вынікі рэалізацыі гістарычных мадэлей мадэрнізацыі беларускага грамадства, у тым ліку савецкай;

• месца і ролю беларускіх земляў у геапалітычных працэсах у асобныя гістарычныя перыяды, уклад беларускага народа ў перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, значэнне і месца суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце;

• дасягненні беларускага народа ў развіцці духоўнай і матэрыяльнай культуры;

***умець:***

• выкарыстоўваць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы пры характарыстыцы асаблівасцяў гістарычнага развіцця беларускага народа;

• характарызаваць умовы і вынікі этнічнага і нацыянальнага фарміравання беларускага народа ў розныя гістарычныя перыяды;

• аналізаваць працэс паслядоўнай змены гістарычных форм дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі, афармлення і замацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

• ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі дзейнасці савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР;

• характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель у асобныя гістарычныя перыяды, уклад беларускага народа ў Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне; аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь ва ўмовах еўрапейскай інтэграцыі і сусветнай глабалізацыі;

• тлумачыць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на гістарычнае развіццё беларускага народа і выкарыстоўваць гісторыка-культурную спадчыну Беларусі ў сваей дзейнасці.

У адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі, падрыхтоўка спецыялістаў у рамках вывучэння спецыялизаванага модуля будзе спрыяць фармаванню ў студэнтаў універсальнай кампетэнцыі:

УК-4. Ведаць заканамернасці гістарычнага развіцця і фарміравання дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў беларускага этнасу ва ўзаемасувязі з еўрапейскай цывілізацыяй.

Дысцыпліна вывучаецца як адзін модуль.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН (дзённая форма навучання)

| Назва раздзелаў і тэм | Агульная колькасць гадзін/ заліковых | Колькасць гадзін: Усяго аўдыторных | З іх: Лекцыі: Гадзіны па плану | З іх: Лекцыі: У тым ліку КСПС | З іх: Семінары: Гадзіны па плану | З іх: Семінары: У тым ліку КСПС |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ***1 (2,3,4) семестр (дыф. залік, экзамен)*** | **72/ 2** | **34** | **18** | **2** | **16** | **4** |
| ***Тэма 1.*** Уводзіны ў дысцыпліну "Гісторыя Беларусі ў кантэксце **еўрапейскай цывілізацыі**". | | 2 | 2 | | | |
| **Раздзел І. Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях** | | **14** | **8** | **2** | **6** | **2** |
| ***Тэма 2***. Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу | | 4 | 2 | | 2 | 2 |
| ***Тэма 3.*** Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст. | | 6 | 4 | 2 | 2 | |
| ***Тэма 4.*** Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.). | | 4 | 2 | | 2 | |
| **Раздзел ІІ. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў XX–пачатку XXI стст.** | | **18** | **8** | | **10** | **2** |
| ***Тэма 5***. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 гг.). | | 4 | 2 | | 2 | |
| ***Тэма 6.*** Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны. | | 4 | 2 | | 2 | |
| ***Тэма 7.*** БССР: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.). | | 4 | 2 | | 2 | |
| ***Тэма 8.*** Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст. | | 4 | 2 | | 2 | |
| Выніковы кантроль | | 2 | | | 2 | 2 |

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН (завочная форма навучання)

| № і назва раздзела | Агульная колькасць гадзін/ заліковых | Агульная колькасць аудыторных гадзін на раздзел | У тым ліку | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| ***1 (2,4,5) семестр (дыф. залік, экзамен)*** | **72 / 2** | **8** | **4** | **4** |
| **Раздзел І. Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях.** | | **4** | **2** | **2** |
| Тэма 3. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст. | | 2 | 2 | |
| Тэма 4. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.). | | 2 | | 2 |
| **Раздзел ІІ. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў XX–пачатку XXI стст.** | | **4** | **2** | **2** |
| Тэма 5. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 гг.). | | 2 | 2 | |
| Тэма 8. Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст. | | 2 | | 2 |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### Тэма 1. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі»

Метадалагічныя асновы вывучэння гісторыі. Перыядызацыя сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі. Цывілізацыя як стадыя развіцця грамадства і як лакальны культурна-гістарычны тып. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця агульнарускай і еўрапейскай гісторыі. Гісторыяграфічныя школы. Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі.

## Раздзел I
## ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

### Тэма 2. Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу

Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель. Пачатак рассялення славян (VI ст.) і славянізацыя балтаў. Старажытнаруская народнасць як аснова фарміравання рускага, беларускага і ўкраінскага этнасаў.

Паходжанне назвы «Белая Русь». Эканамічныя і палітычныя фактары фарміравання беларускага этнасу ў XIV–XVIII стст. Усходнеславянскі этнічны падмурак Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойскага. Роля праваслаўнай царквы ў кансалідацыі беларускага этнасу. Уплыў каталіцтва і уніяцтва. Этнічная самасвядомасць і менталітэт беларусаў. Трансфармацыя ідэнтычнасці і саманазвы беларускага этнасу: рускія, русіны, «тутэйшыя», беларусы. Духоўнае жыццё беларускіх зямель у IX–XVIII стст.

Далейшае развіццё беларускага этнасу ва ўмовах складвання рынкавых адносін у XIX ст. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў. Зараджэнне і развіццё беларусазнаўства. Тэорыя «заходнерусізму». Ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст.

### Тэма 3. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст.

Еўропа ў сярэднявеччы. Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях. Кіеўская Русь. Полацкае і Тураўскае княствы і іх узаемаадносіны з Кіевам і Ноўгарадам. Феадальная раздробленасць. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойскага. Роля беларускіх зямель у працэсе дзяржаўнага будаўніцтва ВКЛ. Асаблівасці фарміравання дзяржаўнага і сацыяльна-эканамічнага ладу на беларускіх землях ВКЛ.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай гісторыі ў Новы час. Эпоха Адраджэння, Рэфармацыя, Асветніцтва. Развіццё капіталізму. Першыя буржуазныя рэвалюцыі ў Заходняй Еўропе.

Люблінская унія. Уваходжанне ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай. Войны XVII–XVIII стст. і іх наступствы для беларускіх зямель. Узмацненне

феадальнай анархіі. Паглыбленне крызісу і падзелы Рэчы Паспалітай паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй. Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

### Тэма 4. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.)

Вынікі ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі ва ўмовах фарміравання індустрыяльнага грамадства. Асноўныя напрамкі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі. Беларускія землі ў перыяд вайны 1812 г. Антырасійскае паўстанне 1830–1831 гг. і яго наступствы.

Расійскі шлях палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі. Адмена прыгоннага права. Буржуазныя рэформы 1860–1870-х гг. і асаблівасці іх здзяйснення ў Беларусі. Спецыфіка прамысловага перавароту ў Беларусі. Месца эканомікі Беларусі ва ўсерасійскім рынку. Змены ў сацыяльнай структуры насельніцтва.

Грамадска-палітычныя рухі і аб’яднанні ў Беларусі. Паўстанне 1863–1864 гг. яго ўплыў на палітыку расійскіх уладаў у Беларусі і грамадска-палітычную думку. Ідэалогія лібералізму, народніцкія і сацыял-дэмакратычныя плыні. Узнікненне агульнарасійскіх і беларускіх партый. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і пачатак расійскага парламентарызму. Сталыпінская аграрная рэформа і асаблівасці яе здзяйснення ў Беларусі. Першая сусветная вайна і яе наступствы для Беларусі.

Лютаўская рэвалюцыя і фарміраванне новых улад. Стратэгія і тактыка палітычных партый у адносінах да ўлады, праблемы выбару шляхоў далейшага грамадскага развіцця. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнага, палітычнага крызісу ў Расіі і расстаноўка палітычных сіл на Заходнім фронце і ў Беларусі восенню 1917 г. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе і ў Беларусі.

## Раздзел II. СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ І ЎМАЦАВАННЕ ЯЕ СУВЕРЭНІТЭТУ Ў ХХ–ПАЧАТКУ ХХІ СТ.

### Тэма 5. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917–чэрвень 1941 гг.)

Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным лёсе беларускага народа. Устанаўленне савецкай улады ў Беларусі. Першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Барацьба супраць германскіх акупантаў.

Праблемы фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ва ўмовах германскай акупацыі. Утварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове (ССРБ, Літбел ССР). Польска-савецкая вайна. Барацьба беларускага народа з польскімі інтэрвентамі. Роля і месца БССР у складзе СССР.

Савецкая мадэль мадэрнізацыі грамадства. Усталяванне савецкай аднапартыйнай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР. Шляхі і метады

будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі (асаблівасці НЭП, індустрыялізацыя, калектывізацыя). Сканцэнтраванне функцый заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады ў руках дзяржаўна-партыйнага апарату. Дэфармацыі ў грамадска-палітычным жыцці БССР. Палітычныя рэпрэсіі 1930-х гг.

Геапалітычнае становішча Беларусі ў 1920–1930-я гг.: вынікі Першай сусветнай вайны; беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы; Рыжская мірная дамова 1921 г. у гістарычным лёсе беларускага народа. Грамадска-палітычнае, эканамічнае і нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.

Уздзеянне савецкага фактару на фарміраванне беларускай нацыі. Станаўленне беларускай савецкай культуры. Палітыка беларусізацыі. Дасягненні і супярэчнасці развіцця культуры і навукі ў 1930-я гг. Стаўленне савецкай улады да царквы.

## Тэма 6. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны

Прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі і Германіі. Абвастрэнне супярэчнасцяў паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў 1930-я гг. Правал палітыкі калектыўнай бяспекі. Пачатак Другой сусветнай вайны. Вызваленне Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі. Аб’яднанне беларускага народа ў складзе БССР.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі. Усталяванне нацысцкага акупацыйнага рэжыму і яго мэты. Палітыка генацыду. Рабаванне гітлераўцамі гаспадарчых і культурных каштоўнасцяў Беларусі. Калабарацыянізм.

Вызначальныя перамогі Чырвонай Арміі (бітвы пад Масквой, Сталінградам, Курскам), іх уплыў на ўздым партызанскага руху і падпольнай барацьбы. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. Пачатак вызвалення Беларусі. Аперацыя «Баграціён». Завяршальныя пераможныя аперацыі Чырвонай Арміі.

Ураджэнцы Беларусі на франтах вайны і ў еўрапейскім руху Супраціву. Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над нацызмам. Захаванне памяці аб гераізме беларускага народа.

## Тэма 7. БССР: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.)

Геапалітычныя змены на міжнароднай арэне пасля Другой сусветнай вайны. Пачатак «халоднай вайны». Супрацьборства дзвюх сацыяльна-палітычных сістэм. Крызіс сусветнай сацыялістычнай сістэмы і яе распад. Заканчэнне «халоднай вайны».

Аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў першае пасляваеннае пяцігоддзе. Калектывізацыя ў Заходняй Беларусі. Эканамічнае развіццё БССР ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Эканамічная

рэформа 1965 г. і яе вынікі. Спецыялізацыя прамысловасці і сельскай гаспадаркі БССР ва ўмовах адзінага народнагаспадарчага комплексу СССР. Зніжэнне тэмпаў вытворчасці і нарастанне крызісных з'яў у эканоміцы. Палітыка перабудовы, курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Чарнобыльская аварыя і яе наступствы. Паглыбленне эканамічнага крызісу ў СССР і БССР у канцы 1980-х гг.

Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Барацьба з антысавецкімі групоўкамі. Ідэалагічныя кампаніі і палітычныя рэпрэсіі ў другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. Асуджэнне культа асобы І.В.Сталіна. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х–1964 гг. Нарастанне кансерватызму ў грамадска-палітычным жыцці ў 1970-я – першай палове 1980-х гг. Першыя крокі па рэфармаванні палітычнай сістэмы ў гады перабудовы. Змяненні ў Канстытуцыях СССР і БССР. Крызіс савецкага федэралізму. «Парад суверэнітэтаў рэспублік», барацьба за суверэнітэт Беларусі.

Адукацыя, навука і культура БССР у пасляваенны перыяд: дасягненні і праблемы. Дзяржаўная рэлігійная палітыка і становішча канфесій.

**Тэма 8. Рэспубліка Беларусь у канцы ХХ–пачатку ХХІ ст.**

Жнівеньскія падзеі 1991 г. у СССР. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Пачатак фарміравання органаў улады і кіравання рэспублікі на прынцыпах суверэнітэту. Распад СССР і ўтварэнне СНД. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Выбары Прэзідэнта і фарміраванне новай сістэмы ўлады. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995 і 1996 гг., іх вынікі. Дапаўненні і змяненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Крызісны стан прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў пачатку 1990-х гг. Стварэнне перадумоў пераходу да рынкавай эканомікі, напрацоўка прававой базы, вызначэнне метадаў і накірункаў рэфармавання эканомікі. Распрацоўка і рэалізацыя беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця краіны. Дасягненні і праблемы беларускай эканомікі. Сучасны стан прамысловасці, сельскай гаспадаркі і сацыяльнай сферы.

Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветных глабалізацыйных працэсаў. Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Выпрацоўка стратэгіі і прынцыпаў знешняй палітыкі, яе шматвектарнасць. Стварэнне Саюза Беларусі і Расіі; Беларусь і СНД; фарміраванне мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы.

Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь. Нацыянальная сістэма адукацыі. Страты і здабыткі беларускай навукі. Стан гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўныя накірункі развіцця літаратуры і мастацтва. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы, адраджэнне рэлігійна-канфесійнага жыцця.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА (дзённая форма навучання)

| Назва раздзела,тэмы, пералік асноўных (базавых) пытанняў. | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго на раздзел, тэму | Лекцыі | Семінарскія заняткі | КСПС | | | |
| **Тэма 1. Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі ў кантэксце** еўрапейскай цывілізацыі”.<br>1. Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння гісторыі.<br>2. Перыядызацыя сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі.<br>3. Гістарыяграфічныя школы. Крыніцы па вывучэнню гісторыі Беларусі. | 2 | 2 | | | [1] | [1–3] | |
| **Раздзел I. Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях** | **14** | 6 | 4 | 4 | | | |
| **Тэма 2. Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу.**<br>1. Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель.<br>2. Паходжанне назвы "Белая Русь" (Беларусь).<br>3.Эканамічныя і палітычныя фактары фарміравання беларускага этнасу ў XIV – XVIII стст.<br>4. Асаблівасці працэсу фарміравання беларускай нацыі. | 4 | 2 | | 2 | [1, 2] | [1–3, 10, 14, 17, 24] | Падрыхтоўка і абарона рэфератаў |
| **Тэма 3. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст.**<br>2. Старажытныя дзяржаўныя ўтварэнні на Беларусі ў IX–першай палове XIII ст.<br>2. Вялікае княства Літоўскае (XIII–першая палова XVI стст.)<br>3.Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (сяр. XVI – кан. XVIII стст.). | 6 | 2 | 2 | 2 | [1,2] | [1–3, 4, 5, 8–10, 12–15, 17, 18, 21, 23–26, 28, 29, 31] | Апытанне па тэме<br><br>Падрыхтоўка і абарона рэфератаў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Тэма 4. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст.–кастрычнік 1917 г.).**<br>1. Адміністратыўна-палітычныя пераўтварэнні расійскіх улад. Вайна 1812 г.<br>2. Грамадска-палітычны рух у першай палове XIX ст. Паўстанне 1830–1831 гг.<br>3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. Рэформа Кісялёва.<br>4. Адмена прыгоннага права. Буржуазныя рэформы 1860–1870-х гг. і іх асаблівасці на Беларусі.<br>5. Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX–пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905–1907 гг.<br>6. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі. | 4 | 2 | 2 | | [1] | [1–3, 4, 8, 9, 11–14, 19, 21–29, 33] | Апытанне па тэме |
| **Раздзел II. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту** | **18** | **8** | **8** | 2 | | | |
| **Тэма 5. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917–чэрвень 1941 гг.).**<br>1. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.<br>2. Стварэнне БССР.<br>3. Польска-савецкая вайна 1920–1921 гг. Рыжскі мір.<br>4. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1921–1939 гг. Усталяванне таталітарнага рэжыму.<br>5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Савецкай Беларусі ў 1918 г.–1930-я гг.: ваенны камунізм, НЭП. Індустрыялізацыя і калектывізацыя.<br>6. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы. | 4 | 2 | 2 | | [1] | [1–4, 8, 9, 11, 14, 16, 20, 32] | Апытанне па тэме |
| **Тэма 6. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны.**<br>1. Міжнароднае становічша напярэдадні Другой сусветнай вайны. Аб’яднанне беларускага народа ў складзе БССР.<br>2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі лета 1941 г. на | 4 | 2 | 2 | | [1] | [1–3, 11, 14, 20] | Апытанне па тэме |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| тэрыторыі Беларусі.<br>3. Нацысцкі акупацыйны рэжым.<br>4 Партызанская і падпольная барацьба.<br>5. Вызваленне Беларусі.<br>6. Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у перамогу над нацызмам. | | | | | | | |
| **Тэма 7. БССР: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.).**<br>1. Аднаўленне народнай гаспадаркі ў пасляваеннае пяцігоддзе.<br>2. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1945–1991 гг.<br>3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 1950-х–першай палове 1980-х гг.<br>4. Нарастанне крызіснай сітуацыі. Перабудова і яе вынікі. | 4 | 2 | 2 | | [1] | [1–4, 8, 9, 11, 14, 16] | Апытанне па тэме |
| **Тэма 8. Рэспубліка Беларусь у канцы XX–пачатку XXI стст.**<br>1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.<br>2. Грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі на сучасным этапе.<br>3. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь. | 4 | 2 | 2 | | [1] | [1–3, 6, 7, 30] | Апытанне па тэме |
| **Выніковы кантроль.** | 2 | | | 2 | | | Кантрольная работа |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА (завочная форма навучання)

| Назва модуля,занятка, пералік асноўных (базавых) пытанняў. | Колькасць аудыторных гадзін | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго на раздзел, занятак. | Лекцыі | Семінарскія занятки | | | |
| **Раздзел I. Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях.** | 4 | 2 | 2 | | | |
| **Тэма 3. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст.**<br>1. Старажытныя дзяржаўныя ўтварэнні на Беларусі ў IX–першай палове XIII ст.<br>2. Вялікае княства Літоўскае (XIII–першая палова XVI стст.).<br>3.Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (сяр. XVI–кан. XVIII стст.). | 2 | 2 | | [1, 2] | [1–3, 4, 5, 8–10, 12–15, 17, 18, 21, 23–26, 28, 29, 31] | |
| **Тэма 4. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст.–кастрычнік 1917 г.).**<br>1. Адміністратыўна-палітычныя пераўтварэнні расійскіх улад. Вайна 1812 г.<br>2. Грамадска-палітычны рух у першай палове XIX ст. Паўстанне 1830–1831 гг.<br>3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. Рэформа Кісялёва.<br>4. Адмена прыгоннага права. Буржуазныя рэформы 1860–1870-х гг. і іх асаблівасці на Беларусі.<br>5. Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX–пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905–1907 гг.<br>6. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі. | 2 | | 2 | [1] | [1–3, 4, 8, 9, 11–14, 19, 21–29, 33] | Апытанне па тэме |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Раздзел II. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту.** | 4 | 2 | 2 | | | |
| **Тэма 5. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917–чэрвень 1941 гг.).**<br>1. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.<br>2. Стварэнне БССР.<br>3. Польска-савецкая вайна 1920–1921 гг. Рыжскі мір.<br>4. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1921–1939 гг. Усталяванне таталітарнага рэжыму.<br>5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Савецкай Беларусі ў 1918 г. – 1930-я гг.: ваенны камунізм, НЭП. Індустрыялізацыя і калектывізацыя.<br>6. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы. | 2 | 2 | | [1] | [1–4, 8, 9, 11, 14, 16, 20, 32] | |
| **Тэма 8. Рэспубліка Беларусь у канцы XX–пачатку XXI стст.**<br>1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.<br>2. Грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі на сучасным этапе.<br>3. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь. | 2 | | 2 | | [1–3, 6, 7, 30] | Апытанне па тэме |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў:

1. Электронныя прэзентацыі курса лекцый па "Гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі".
2. Экспанаты Музея культуры і побыту беларускага сялянства (БДАТУ) : секцыі "Археалогія, вырабы з керамікі і жалеза", "Кавальства. Сельскагаспадарчая тэхніка".

### Пералік сродкаў дыягностыкі рэзультатаў вучэбнай дзейнасці

1. Вуснае і пісьмовае апытванне
2. Падрыхтоўка рэфератаў па вывучанаму матэрыялу
3. Тэсты
4. Індывідуальныя заданні
5. Залік (дыфірэнцыяваны залік)
6. Экзамен

### Пералік семінарскіх заняткаў

1. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX – XVIII стст.
2. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст.–кастрычнік 1917 г.).
3. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917–чэрвень 1941 гг.).
4. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны.
5. БССР: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.).
6. Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст.

### Кіруемая самастойная праца студэнтаў

КСПС ажыццяўляецца шляхам падрыхтоўкі і абароны рэфератаў.

### Тэма : Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу.

1. Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель
2. Паходжанне назвы "Белая Русь" (Беларусь)
3. Эканамічныя і палітычныя фактары фарміравання беларускага этнасу ў XIV – XVIII стст.
4. Асаблівасці працэсу фарміравання беларускай нацыі.

### Тэмы рэфератаў:

1. Першабытная культура: вераванні і мастацтва.
2. Язычніцкія святы – ад старажытнасці да сучаснасці.
3. Краснасельскія шахты і іх роля ў гаспадарчым развіцці Беларусі.

4. Рассяленне індаеўрапейцаў на Беларусі. Праблема прарадзімы індаеўрапейцаў.
5. Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі.
6. Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў.
7. Фарміраванне беларускай народнасці.
8. Паходжанне назвы “Белая Русь”.
9. Этнічныя меншасці у Беларусі (XV – XVIII ст.)
10. Рэфармацыйны рух у Еўропе: сутнасць і асаблівасці. Своеасаблівасці Рэфармацыі на беларускіх землях.
11. Ордэн езуітаў на Беларусі: палітычная, культурная і асветніцкая дзейнасць.
12. Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г. і роля ўніяцкай царквы.
13. Этнічная катастрофа сярэдзіны XVII ст.: прычыны і наступствы.
14. Зараджэнне і развіццё беларусазнаўства.
15. Францішак Багушэвіч і фактар мовы ў станаўленні беларускай нацыі.
16. Канфесійны фактар ў фарміраванні беларускай нацыі.
17. Ідэалогіі заходнерусізма і краёвасці і іх ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё Беларусі.
18. Народніцкі рух на Беларусі. Беларускі гурток “Гоман”.
19. “Нашаніўскі” перыяд развіцця беларускай культуры
20. Беларускае Адраджэнне пачатку XX ст.: прычыны і асноўныя накірункі.
21. Беларускае Адраджэнне пачатку XX ст.: асобы.
22. Сучасны стан беларускага грамадства: пытанні захавання ідэнтычнасці ва ўмовах глабалізацыі.

**Тэма: Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX – XVIII стст.**

1. Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (сярэдзіна XVI – канец XVIII стст.).

**Тэмы рэфератаў:**

1. Люблінская ўнія: прычыны, умовы, наступствы.
2. Роля ВКЛ у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай.
3. Рэч Паспалітая і падзеі Смутнага часу ў Маскоўскай дзяржаве.
4. Войны з Швецыяй і турцыяй ў першай 1/3 XVII ст.
5. Казацка-сялянская вайна 1648-1651 гг. і падзеі на Беларусі.
6. Вайна Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай (1654 – 1667 гг.) і яе наступствы.
7. Беларусь ў гады Паўночнай вайны (1700-1721 гг.)
8. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў XVII-XVIII стст.
9. Сялянскія паўстанні на Беларусі XVIII стст.
10. Магнацкія тэатры Беларусі.
11. Бляск і слава Радзівілаў: прадстаўнікі княжацкага роду і іх роля ў гісторыі.
12. Мануфактурная вытворчасць Беларусі.

13. Слуцкія паясы – шэдэўр беларускай культуры.
14. Распаўсюджванне сістэмы адукацыі і навуковых ведаў XVII-XVIII стст.
15. Развіццё выяўленчага мастацтва Беларусі ў XVII-XVIII стст.
16. Шляхецкая анархія як прычына заняпаду Рэчы Паспалітай.
17. Спробы палітычных і эканамічных рэформаў у Рэчы Паспалітай. Дзейнасць А. Тызенгаўза.
18. Падзелы Рэчы Паспалітай 1772 і 1793 гг.
19. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі і трэці падзел Рэчы Паспалітай.
20. Кіраўнікі і ўдзельнікі паўстання 1794 г. і іх лёс.

## Літаратура

### Асноўная

1. Брыгадзін, П. І. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў / П. І. Брыгадзін. – Мінск : ДІКСТ БДУ, 2015. – 288 с.
2. Новик, Е. К. История Беларуси. С древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик ; под ред. Е. К. Новика. – 3-е изд., испр. и доп. - Минск : Вышэйшая школа, 2012. – 544 с.
3. История Беларуси в контексте европейской цивилизации [Электронный ресурс] : электронный учебно-методический комплекс по учебной дисциплине "История Беларуси в контексте европейской цивилизации" обязательного модуля "История" / Минсельхозпрод РБ, УО "БГАТУ", АМФ, Кафедра философии и истории ; сост. : Н. В. Анофренко [и др.]. – Электронные данные (80 504 973 байт). – Минск : БГАТУ, 2015.

### Дадатковая

4. Аргучинцев, Г. К. История государства и права Республики Беларусь в вопросах и ответах / Г. К. Аргучинцев. – Минск : Амалфея, 2012. – 216 с.
5. Беларускія летапісы і хронікі / уклад. У. Арлоў ; рэд. В. Чамярыцкі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с.
6. Беларускае замежжа = Белорусское зарубежье / Дэпартамент па архівах і справаводстве М-ва юстыцыі РБ, Нацыянальны архіў РБ, Нацыянальны гістарычны архіў РБ, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне, Бел. дзярж. архіў-музей літаратуры і мастацтва ; [склад. Н. А. Голубева ; рэдкал. : У. І. Адамушка і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі , 2010. - 480 с.
7. Белорусский путь развития (вопросы и ответы) : справочник / М. Г. Жилинский [и др.] ; Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Институт истории НАН Беларуси ; [под общ. ред. М. Г.

Жилинского]. – Минск : Академия управления при Президенте Респ. Беларусь, 2017. – 184 с.
8. Бригадин, П. И. История Беларуси в контексте европейской истории : курс лекций / П. И. Бригадин. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2007. – 336 с.
9. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэбны дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, І. У. Вішнеўская. – Мінск : ТетраСистемс, 2005. – 192 с.
10. Гісторыя Беларусі : курс лекцый. У 2 ч. Ч. 1 : Са старажытных часоў да канца XVIII ст / І. П. Крэнь [і інш.] ; рэдкал. : П. І. Брыгадзін. - Мінск : РІВШ БДУ, 2000. - 656 с.
11. Гісторыя Беларусі : курс лекцый. У 2 ч. Ч. 2 : XIX-XX стагоддзі / П. І. Брыгадзін [и др.] ; БДУ, ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал. : П. І. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – 656 с.
12. Гісторыя сялянства Беларусі. У 3 т. Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я. К. Анішчанка [і інш.] ; рэд. : В. І. Мялешка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1997. - 431 с.
13. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый : вучэбны дапаможнік / В. І. Галубовіч [і інш.] ; пад рэд. В. І. Галубовіча, Ю. М. Бохана. - 2-е выд. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. - 589 с.
14. Гісторыя Беларусі : вучэбна-метадычны комплекс / БДАТУ, Кафедра філасофіі і гісторыі ; [склад. : В. Г. Маскалеў і інш.]. – Мінск, 2009. – 164 с.
15. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.] ; [рэдкал. : М. Касцюк і інш.] ; рэд. тома : Ю. Бохан, Г. Галенчанка]. – Мінск : Современная школа : Экоперспектива, 2008. – 688 с.
16. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6 : Беларусь ў 1946 - 2009 гг. / Н. Васілеўская [і інш.] ; [рэдкал. : М. Касцюк і інш. ; рэд. тома У. Навіцкі]. – Мінск : Современная школа : Экоперспектива, 2011. - 728 с.
17. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 1 : Старажытная Беларусь. Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / В. Вяргей [і інш.] ; [рэдкал. : М. Касцюк і інш.] ; рэд. тома : М. Чарняўскі, Г. Штыхаў]. - Мінск : Современная школа : Экоперспектива, 2007. - 352 с.
18. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII-XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.] ; [рэдкал. : М. Касцюк і інш.] ; рэд. тома : Ю. Бохан, П. Лойка]. – Мінск : Современная школа : Экоперспектива, 2007. – 344 с.
19. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.] ; [рэдкал. : М. Касцюк і інш.) ; рэд. тома : В. Яноўская, С. Рудовіч]. – Мінск : Современная школа : Экоперспектива, 2007. - 520 с.
20. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5 : Беларусь у 1917-1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.] ; [рэдкал. : М. Касцюк і інш.] ; рэд. тома : М. Касцюк]. - Мінск : Современная школа : Экоперспектива, 2007. – 624 с.

21. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да 1996 г. У 3 т. Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Г. Я. Анішчанка [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; [рэдкал. : В. І. Мялешка і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1997. - 431 с.
22. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзен. У 3 т. Т. 2 : Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгауз [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; пад рэд. В. П. Панюціча ; рэдкал. : М. С. Сташкевіч [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 552 с.
23. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т. І. Доўнар. – 2-е выд. – Мінск : Амалфея, 2008. – 400 с.
24. Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі ; Нацыянальны архіў РБ ; пер. з рус. : Т. М. Бутэвіч, Т. М. Кароткая, Е. П. Фешчанка. – Мінск : БелЭн, 1994. – 510 с.
25. Ластоўскі, В. Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 126 с.
26. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 512 с.
27. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 1 : Культура сацыяльнай эліты XIX - пачатку XX ст. / А. І. Лакотка [і інш.] ; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Філіял "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы" ; [навук. рэд. А. І. Лакотка, рэд. калег. : А. І. Лакотка і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – 575 с.
28. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 2 : Культура гарадоў X - пачатку XX ст. / А. І. Лакотка [і інш.] ; НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Філіял "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы" ; [навук. рэд. А. І. Лакотка ; рэдкал. тома : А. І. Лакотка і інш.]. - Мінск : Беларуская навука, 2014. – 575 с.
29. Саракавік, І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. – 2-е выд. – Мінск : Современная школа, 2009. – 456 с.
30. Слука, А. Г. Нацыянальная ідэя: шлях народа (генезіс праблемы) / А. Г. Слука. – Мінск : РІВШ, 2005. – 428 с.
31. Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі : новыя матэрыялы і даследаванні / рэд. В. М. Ляўко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 152 с.
32. Траццяк, С. А. Брэсцкі мір і грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі: лістапад 1917 – студзень 1919 г. / С. А. Траццяк ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 2009. – 208 с.
33. Цьвікевіч, А. "Западно-руссизм". Нарысы з гісторыі грамадзкай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цьвікевіч ; аўтар пасляcл. А. Ліс. - 2-е выд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

| № п/п | Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб змене ў змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратаколу) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Паліталогія | сацыяльна-гуманітарных дысцыплін | | Узгоднена Пратакол № 11 ад 19.04.2019 г. |

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДАТУ

__________М.М. Раманюк

«__»_________20__ г.

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ НА20__-20__ вучебны год**

| №№ пп | Дапаўненні і змены | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і ўхвалена на пасяджэнні кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (пратакол № __ ад ______2019 г.)

Загадчык кафедры Я. А. Грэбень

Начальнік ЦНМ і ВР Л. К. Лоўкіс

**УЗГОДНЕНА**

| | |
|---|---|
| Дэкан АМФ | В. Б. Лоўкіс |
| Дэкан ФТС | А. В. Мірановіч |
| Дэкан АЭФ | І. В. Пратасавіцкі |
| Дэкан ІТФ | А. А. Брэнч |
| Дэкан ФПК | У. М. Сінельнікаў |